Самапомач
Samapomač

Беларуская кооперацыйна-гаспадарчая часопісь

Год IV. | Вільня, Люты—Сакавік 1935 г. | № 2—3.


Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!..

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомаччу.

Джордж РЭССЭЛЬ
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 2—3 (31—32).

Ceny ŭ Vilni

15.III.35. Ceny za 100 kilohram.

Žyta	13.00—14.50
Pšanica	17.50—19 00
Jačmień	12,50—15 00
Avios	12.75—14 25
Hrečka	15 00—17.00
Muka pšaničnaja	13.00 - 32 00
Muka, žytniaja da 55%	23 00—23.50
Muka žytniaja da 65%	19.00—20 00
Muka sitkovaja	15 00—15 50
Muka razovaja	15.00—15.50
Muka žyt. da 82% (typ vajskovy)	17.50—18 00
Votruby žytnija	7 00 - 7.50
Votruby pšaničnyja	10,00—10,50
Siena	7.00—7 50
Sałoma	3.75—4.25
Siemia lnianoje	45.25 - 47 25
Makuch, lanny	—18 00
Makuch sonješnikavy	—17 00
Makuch repakavy	—13.00
Makuch kanaplany	—11.00

Małočnaje za 1 kilo.

Masła najlepšaje, za kilo ŭ hurcie . . .	2,60
„ „ „ „ „ u detalu	2.90
Masła stałovaje za kilo ŭ hurcie . . .	2.40
„ „ „ „ „ u detalu	2.70
Masła solenaje za kilo ŭ hurcie	2.00
„ „ „ „ u detalu	2.20
Syr navahradzki, za kilo ŭ hurcie . . .	2 30
„ „ „ „ „ u detalu	2.80
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie	1.70
„ „ „ „ u detalu	2.00
Jajki, kapa	3.00—4.20
„ štuka	6—8 hrašoŭ.

Miasnoje za 1 kilo bitaj vahi.

Vałovina, całyja štuki, ...	0.60—0.80
„ zady	0.70—0.90
„ pierady (košer) . . .	0.90—1.10
Cialacina, ... , . .	0.60 - 0.70
Svinina	0.80—0.90

Skury syryja.

Skury bydlačyja, syryja, za 1 kilo .	0.70—0.75
Skury cialačyja, za štuku	3.50—4.50

Samapomač

BIEŁARUSKI KOOPERATYŨNA - HASPADARSKI ČASAPIS.

Adres: VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod IV.	Vilnia, Luty-Sakavik 1935 h.	Nr. 2-3(31-32).

BIEŁARUSKAJE NARODNAJE ŚVIATA.

Kožny žyvy narod pavinien šanavać svaju ḫistoryju, asabliva jejnyja śvietłyja mamenty.

U najnaviejšaj ḫistoryi Biełaruskaḫa Narodu ḫetkim mamentam jošć dzień 25 sakavika 1918 ḫodu, kali vybranyja na Ŭsiebiełaruskim Kanḫresie ŭ Miensku pradstaŭniki abvieścili Niezaležnaść Biełarusi ŭ formie Narodnaj Respubliki.

Ad ḫenaḫa pamiatnaḫa dnia sioleta 25-ḫa sakavika minaje 17 ḫadoŭ.

Zorka našaj dziaržaŭna-palityčnaj niezaležnaści na karotki tolki čas zaśviaciła na zachmuranym niebaschile i ŭznoŭ zakryłasia čornymi chmarami čužoj nad nami pieramoḫi.

Žyćcio narodnaje ŭznoŭ zyjšło z šyrejšaḫa kruḫazoru, ale nie zapyniłasia. Pačałasia praca cichaja, ale biazupynnaja, krok za krokam, kapla pa kapli. A płady ḫetaj pracy vidavočny: štoraz bolš pašyrajecca ŭ narodzie śviedamaść, što

1. čužynieć nam doli nia dašć, a zaŭsiody ḫatoŭ vykarystać časovuju našu słabasć, kab ḫetu dolu adabrać;

2. doli nichto naaḫuł nie daje, a jaje treba brać, zdabyvać i što

3. najlepš, bo sapraŭdy paludzku žyvie toj narod, jaki ŭžo svaju dziaržaŭna-palityčnuju niezaležnaść zdabyŭ.

Usio ḫeta choć na paḫlad i vydajecca niečym adarvanym, dalokim ad žyćcia, to ŭ sapraŭdnaści adnak vielmi ciesna z ḫetym žyćciom źviazana, asabliva-ž z žyćciom ḫaspadarčym. Prykłady ḫetaḫa dajuć nam našy susiedzi, jak litoŭcy, łatyšy, palaki, esty i inš. Dosyć paraŭnać toje, što mieli jany prad zdabyćciom svaje niezaležnaści i toje, što majuć siaḫońnia. Poŭnaść i razmach ichnamu žyćciu dała sobskaja dziaržaŭna-palityčnaja niezaležnaść!

Pamiatajma ab ḫetym zaŭsiody, a asabliva što-ḫod u dzień 25 sakavika. A tady i dla nas Biełarusaŭ dola pierastanie być mačychaj.

KOOPERATYŨNYJA NAVINY.

Dalšy los polskaha „Związku Spółdzielni Rolniczych i Zarobkowo-Gospodarczych“. Vyšmienavany „Zwiazek“ paŭstaŭ, jak viedama, z nakazu „Kooper. Rady“, jakaja jošć paduładnaj ministerstva Skarbu i maje abymać bolš 5-cioch tysiač usiakich kooperatyvaŭ, bolš ci mienš ziemlarobskaha charaktaru, pa cełym abšary sučasnaj Polšcy, u tym liku i na našych biełaruskich ziemlach. U skład Hałoŭnaj Rady hetaha Sajuzu ŭvachodziać až 14 pradstaŭnikoŭ naznačanych tudy ŭradam. Aprača taho jošć jašče ŭradavyja čynoŭniki i jak delehaty ad samych sajuznych kooperatyvaŭ, tak što ahułam uziata ŭ Radzie najvyšejšaj polskaj kooperatyŭnaj (ziemlarobskaj) ustanovy majuć badaj pieravahu ludzi nia z vybaru, a z naznačeńnia. I ŭ hetym biada, bo ludzi zvyčajna słužać tamu, ad kaho jany zaležać.

24 studnia siol. adbyłosia ŭ Varšavie pieršaje pasiedžańnie vyšejpakazanym sposabam sabranaj Hałoŭnaj Rady Sajuzu, na jakim vybrany byŭ prezydyjum Rady i Hałoŭnaja Uprava. Staršynioj Prezydyjumu Rady vybrany byŭ Dr. Zajdlic, vice-staršyniami: Ks. V. Biliziński, pas. Hlinski i L. Plucinski, sekretarami: V. Uzdebski (čynoŭnik „Koop. Rady“) i St. Sadkoŭski. U Hałoŭnuju Upravu Sajuzu paklikany: K. Kierzkowski (hał. dyrektar), A. Čachyra, A. Novakoŭski, B. Tomčykoŭski i V. Vitvicki.

Cikava, što novy Sajuz adrazu maje dva časapisy: „Czasopismo Spółdzielni Rolniczych“ i „Poradnik Spółdzielni“. Vidać, što bahatych maje kumoŭ. Ale ŭsio-ž, ci nie za šmat hetaha?

„Stalinaŭski Statut“. Niezajzdrosnyja rezultaty pracy balšavikoŭ u halinie pracy kooperatyŭna-spažyvieckaj. A voś apošnija viestki z Savietaŭ nakazvajuć, što tam pad vidam kooperacyi pryhataŭlajecca novy pachod na niedabitaje sialanstva. Sprava vyhladaje hetak:

U Maskvie adbyŭsia anahdaj (luty 1935) 2-hi źjezd „šturmavikoŭ ziemlarobstva“, heta znača takich ludziej, katoryja asabliva adznačylisia pry nieščaślivaj kolektyvizacyi ziemlarobskaj vioski. Źjechałasia blizu 2000 ludziej sapraŭdy dziela taho tolki, kab pasłuchać i „začviardzić“ **prykładny statut ziemlarobskaj kooperatyvy,** h. zv. **„artieli“.*)** Farmal-

*) „artiel“ — heta papularnaja svajho času ŭ Rasie, forma rabotnickaj kooperatyvy.

na heta tolki ŭzor statutu, jaki maje ŭvachodzić u siłu tolki tady, kali jaho pryjmuć siabry novazakładanaj, farmalna — dabravolnaj, kooperatyvy. U sapraŭdnaści adnak heta nia prykładny „stalinaŭski statut", a ŭstavovy zakon, jak ab hetym niadvuznačna skazaŭ na tym-ža źjeździe kamisar Rubinštajn — Jakaŭleŭ... Pavodle hetaha statutu-zakonu majuć być pieraarhanizavany ziemlarobskija kolektyvy (komuny). Siabram takoj „kooperatyvy" moža być kožny poŭnapraŭny (nia „kułak" i nia „lišeniec") hramadzianin SSSR. Hałoŭnaj źmienaj, jakuju ŭvodzić statut „artieli", jość toje, što **ziamla** abrablanaja artielaj faktyčna **stanovicca jejnaj ułasnaściu** (farmalna „viečnaje ŭžytkavańnie"). Pavialičać hetu ŭłasnaść možna, ale nia možna jaje adstupać, pradavać i naahuł źmianšać. Vystupić z artieli tak ža možna, ale nia možna zabrać z saboj nazad uniesienaj ziamli, ani čaho inšaha.

Navinoj tak-ža jość i toje, što siabrom artieli, pavodle „statutu, pryznajecca prava mieć ułasnuju pamieškalnuju chatu, peŭny lik žyvioły, chatnich ptušak (kurej, kačak i h. d.), a tak-ža ad čviertki da cełaha hektara ziamli.

Hetak dumajuć balšaviki arhanizavać svaju viosku ciapier, kali pabačyli, što kamuny ichnyja da mety nie davodziać.

Dla nas, z boku hledziačy, najsumniej toje, što i tut ludzi robiać sabie paravan z biezbaronnaj kooperacyi.

Straty českaj ziemlarobskaj kooperacyi. U kancy min. 1934 h. pamior vicestaršynia čsł. Sajuzu Zieml. Kooperatyvaŭ Fr. Trojan, a na pačatku siol. 1935 (15.I.) pamior staršynia elektryfikacyjnaj Kamisii taho-ž Sajuzu — Inž. J. Černy. Abodva pracaŭniki vielmi zasłužylisia dla českaj vioski: pieršy (Trojan) u halinie arhanizavańnia kooperatyvaŭ kredytovych, a druhi (Černy) — kooperatyvaŭ dziela dastaŭki českaj vioscy elektryčnaj enerhii dla aśviatlańnia i pahaniańnia roznych haspadarskich mašyn i cełych fabryk.

— Viečnaja pamiać!

Asiročanaj českaj ziemlarobskaj kooperacyi składajem na hetym miescy naša ščyraje spačućcio.

60-yja ŭhodki praf. Totomianca. 3 lutaha siol. dažyŭ 60-ci hadoŭ adzin z najpapularniejšych sučasnych teoretykaŭ kooperacyi praf. Dr. Vahan Totomianc. Ahulna pavažany jubilat pa nacyjanalnaści jość Armiancam, choć matkaj jahonaj była ryžskaja Niemka. Vučyŭsia T-c ŭ Švajcaryi i naahuł u Zach. Eŭropie. Viarnuŭšysia ŭ Rasieju prad vajnoj, musiŭ stul uciakać prad balšavikami ŭ svoj rodny Tyflis (Kaŭkaz), a kali i tam pieramahli balšaviki — pierajaždžaŭ pa čarzie ŭ Rym, Berlin, Prahu, a ciapier znachodzicca ŭ Sofii (Baŭharyja). Litaraturnaja čynnaćć praf. T-ca vielmi płodnaja. Aprača stałaha supracoŭnictva ŭ biazlikich kooperatyŭnych časapisach ŭsich krajoŭ i narodaŭ, Jubilat vydaŭ i niekalki asobnych knižak, ab cennaści jakich śviedčyć choć-by toje, što niekatoryja z ich, jak napr. Padručnik kooperacyi, pieratłumačany na 15 jazykoŭ. Napisaŭ taksama praf. T-c dvutamovuju „Kooperatyŭnuju antolohiju" (čytanku), „Historyju ekanamičnych i socyjalnych navuk" i šmat šmat inš.

Ad času vyjezdu na emihracyju praf. T-c ciažka zaniamoh na vočy. Ad hetaj pary im uściaž apiakujecca jaho rodnaja dačka, jakaja adnačasna vykonvaje i abaviazki pryvatnaha sekretara.

Pavažanamu Jubilatu ščyra žadajem dačakacca lepšaj doli, a pierad usim ciešycca z zdaroŭja, niastaču jakoha Jon zmušany hetak horka adčuvać.

Mnohija lety!

„Hurt" nia hurtuje. U svaim časie vierab'i na strechach čyrykali ab tym, našto ŭ Polščy pravodzicca źmiena zakonu ab kooperatyvach. Asabliva heta adnosiłasia da kooperatyvaŭ niapolskich. Siahońnia heta spraŭdžajecca miž inšym na kooperatyvach ukrainskich na Vałyni. Hetym kooperatyvam novy zakon zabaraniŭ naležać da svajho ukrainskaha Sajuzu (RSUK) ŭ Lvovie. Uzamien za hety Sajuz, pad apiekaj polskich uradavych kołaŭ byŭ sarhanizavany na Vałyni novy Sajuz „Hurt", jakomu i i pryznačana žać toje, čaho nie pasiejaŭ: padbirać da siabie hatovyja ŭžo ukrainskija kooperatyvy. I sapraŭdy, takoje „padbirańnie" ciapier pačałosia. Pavodle viestak z Vałyni, z novych paradkaŭ tam nie zdavoleny adnak ni sam „Hurt", ni zachoplenyja im u pałon ukrainskija kooperatyvy. „Hurt" nie zdavoleny, bo nie apraŭdyvajucca jahonyja nadziei razžyvacca čužym dabrom; nie zdavoleny i samyja kooperatyvy, bo pabačyli ciapier jasna, što z „Hurtam" jany nie razžyvucca, a tolki pražyvuć toje, što dahetul prydbali. Dy i naahuł pytańnie, ci „Hurt" praznačany, kab ukrainskuju kooperacyju na Vałyni budavać, ci jaje rujnavaŭ. Adkaz na heta daść blizkaja budučynia.

HRAMADZIANIE!

Paśpiašeciesia prysłać hrošy na padpisku dałučanymi da hetaha numaru „Samapomačy" blankietami P.K.O., abo razrachunkovymi pierakazami, jakija pradajucca na kožnaj pošcie pa 1 hrašu za štuku. Numar kartoteki „Samapomačy" jość 40.

Chto nia pryšle hrošaŭ na padpisku, tamu dalšaja vysyłka časapisu budzie ŭ s t r y m a n a.

Administracyja „SAMAPOMAČY."

Сельская гаспадарка.

Ня трымайце вады на полі!

Ураджайнасьць поля залежа ад мноства спажыўных сучастак, стала гатовых на корм для засеенай ці засаджанай расьліны. Кожная расьліна аднак ёсьць жывой і як такая мусіць ня толькі карміцца, але і дыхаць; а для гэтага мусіць мець дастатак вольнага паветра. Зімой расьліна ня жыве і таму ня дыхае; можа дзеля таго спакойна адпачываць пад сьняговай пакрыўкай і не патрабуе доступу паветра.

Гэткі адпачынак расьліны трывае аднак так доўга, як доўга трываюць маразы. Калі-ж сьнег пакрые напр. увосені азімую рунь перш, чым яна „засьне" (замерзьне), дык такая рунь ад недастатку паветра задушыцца („адапрэе").

Тое самае дзеецца і вясной, калі напр. на адтаіўшую і зазелянеўшую („аджыўшую", „прачхнуўшуюся") рунь ападзе раптам сьнег і даўжэй паляжыць; рунь тады таксама „адапрэе", а сапраўды — задушыцца ад недастатку паветра.

Аднак зачыніць доступ паветра да жывой расьліны можа ня толькі сьнег, — яшчэ больш гэта робіць вада з растаіўшага сьнегу.

Знача, і сьнег і вада вясной на засеным полі вельмі не пажаданая і як толькі вясьнянае цяпло абудзіць прыроду — трэба старацца ўсімі сіламі, каб ні сьнег, ні вада з яго не стаяла на полі аніводнай лішняй гадзіны.

Вышэйшыя мясцы на полі самі хутка звальняюцца спад сьнежнага пакрыцьця і помачы людзкой патрабуюць толькі роўныя палі, а тымбольш — лагчыны. Вось-жа ў такіх лагчынах трэба вясной перад усім ўсякім даступным спосабам узварушыць сьнег (рыдлёўкай, віламі, жалезнай бараной), каб у яго лепш упівалася вясьнянае цяпло і растапляла на ваду, каторую ўзноў таксама трэба **чым-хутчэй спускаць** у ручаі і рэчкі.

Незасеенае поле таксама трэба чымхутчэй асушаць, каб раней можна было выйсьці на яго з бараной, бо **„хто спозьніцца вясной на дзень, той не дагоне пасьля і месяцамі".**

С. Я—віч.

Пакуль ня маем сваіх гаспадарскіх школ, — вучыцца можам толькі з часапісу і кніжкі — ці Вы з гэтага карыстаеце?

Jak vyhladała ŭ nas panščyna ŭ 40-ych hadoch min. stahodździa.

(Vypiska z „Biełaruskaha Litaraturna-Navukovaha časapisu KAŁOŚSIE" — knižka I, bač. 53—55).

„...Źniavieryŭšysia da ŭsiaho, ci źniavierańniem tolki prykryvajučysia, usio bolšy lik šlachty viartaŭsia da ziemlarobstva i pačynaŭ haspadaryć, zamykajučysia hetak u vuzki kruh svaich pryvatna-haspadarskich intaresaŭ. Pabudžała šlachtu da hetaha i dobraja tahačasnaja końjunktura na suśvietnym rynku, dziakujučy jakoj pradukty ziemlarobstva znachodzili tam vielmi dobry zbyt. Heta tak „uzachvočvała" šlachtu da ziemlarobstva, što jana ŭsio novyja abšary zabirała pad svaju dvornuju haspadarku, abrezvajučy hetym samym nadzieły sialanskija, abo i całkom vykidajučy sialan z zahaspadaravanych sialibaŭ na biazvartasnyja i zusim dzikija pustyry.

Inventarnyja kamitety. Sialanie-ž pastaromu byli zusim biezbaronnyja i, daviedzienyja da astatku ciarplivaści, znachodzili adziny tolki sposab — uciakać, kudy vočy śviecjać. Kali hetkaje ŭciakańnie stavałasia štoraz čaściejšym, a navat masavym, u dvaroch pačaŭsia adčuvacca niedastatak rabočych ruk. Nie znachodziačy inšaha sposabu papoŭnić hety niedastatak, pamieščyki pačali abkładać sialanstva jašče novymi, ciažejšymi pryhonnymi zabaviazańniami*). Hetkaje samavolnaje pavialičeńnie panščyny było nahetulki ciažkim i dakučlivym, što razdražniła navat i biełaruskaha sielanina, naahuł zraŭnavažanaha i spakojnaha. Pačalisia spačatku skrytyja, a paśla i jaŭnyja razruchi. Na heta adnak nia moh užo astacca ślapym i rasiejski ŭrad i, nia chočučy dapuścić da horšaha, pryniaŭ hetym razam vyhodnuju dla siabie minu abaroncy sialanstva, nakazvajučy 15 krasavika 1844 h. sarhanizavać miž inš. u Vilni Haŭoŭny, a ŭ Koŭni i Horadni—huberskija, hetak zvanyja Inventarnyja Kamitety, zadańniem jakich było śpisać usie pryhonnyja zabaviazańni i pravy sialan pierad dvarami ŭ kožnym paasobnym vypadku, u kožnaha pamieščyka. Hetak ustanoŭlenych zabaviazańniaŭ niamožna było adhetul ni źmianić, ni pavialičyvać**).

*) Witold Staniewicz: Rzut oka na rozwój dziejów ograrnych na ziemiach litewskich. Adbitka z „Ateneum Wileńskie" Nr. 5, Vilnia, 1924 h.

**) Witold Staniewicz: Rzut oka...

Салома як паша.

У штодзенным паняцьці ў нас саломай называюць ацьвярдзеўшае сьцябло жыта, пшаніцы, ячменю, аўса. У сапраўднасьці аднак саломай ёсьць перасьпеўшае і ацьвярдзеўшае сьцябло ўсякае травяністае і наагул кармовае расьліны. Можна дзеля таго гаварыць аб саломе канюшыны, сэрадэлі, вікі, гароху і г. д. Больш таго: сьцябло мурожнай травы, калі яно прастаіць на пні да часу высьпяленьня зярняці, дык з яго ўжо ня будзе сена, а звычайная салома. І наадварот— сьцябло ўсякага збожжа (жыта, аўса і г. д.) зжатае ці скошанае за зялёна перад тым, як дасьпее да зярняці, дае поўнавартаснае сена. Дык няма, як бачым, гатунковага падзелу расьлін на такія, якія давалі-б салому і такія ўзноў, якія давалі-б сена: адна і тая ж расьліна можа даць сена, а можа даць і салому. Усё залежа ад таго, калі такая расьліна косіцца: за зялёна ці за сьпела.

Гэтыя агульныя ўвагі аднак цікавыя і важныя на час сенакосу, калі ў нас найлепшае сена перамяняецца на звычайную салому. Для нас-жа тут важна ведаць, якую кармовую вартасьць мае салома ў штодзенным гэтага слова значэньні і як гэту салому падаваць жывёле, каб яна яе найлепш выкарыстала.

Кармовая вартасьць саломы залежа ад гатунку збожжа, ад глебы, ад гнаеньня, часу сьпяленьня, спосабу зьбіраньня з поля і ўрэшце — ад пагоды.

Агулам узята кармовая вартасьць саломы невялікая. Найбольш і найлепш выкарыстоўвае яе жывёла жвачная: авечка, скаціна, каторым без асаблівай страты можна падаваць салому нярэзаную нават на сечку, а толькі дакладна вытрэсеную. Гэтак напр. практычныя гадаўцы скаціны ў Даніі кормяць кароў пераважна саломай толькі перацёртай, ня рэзанай на сечку, дадаючы, натуральна, патрэбную колькасьць сена і зярністай ды сакавістай (пашныя буракі) пашы на абмешку.

Іншай жывёле, як коням, сьвіням, можна і трэба падаваць салому толькі парэзаную на сечку.

Як аб'ёмістая паша, салома і сечка з яе сама па сабе вялікай кармовай вартасьці ня маюць. Значэньне саломы ў тым толькі, што пры пеpажоўваньні яе жывёла лепш перацірае і перасьлінівае ўсю спажытую пашу. Больш таго: жвачная жывёла ня можа без аб'ёмістай пашыператравіць ніякай пашы.

Усю салому наагул, паводле ейнае кармовае якасьці, можна падзяліць на дзьве вялікія часьці: на групу саломы азімай і групу саломы яравой.

Агульна пашыраны пагляд аб тым, што кармовая якасьць яравой саломы большая чымся ў саломы азімай, ня ўсюды і ня скрозь пацьверджаецца. Найнавейшыя навуковыя досьледы паказваюць, што гэтыя розьніцы ня так ужо вялікія. Затое салома з палёгшага збожжа, як багацейшая на азотныя складовыя часткі, лепш прыгодная на корм,

---

Kab u małoj choć miery mieć paniaćcie ab tym, jak vyhladała ŭ nas panščyna ŭ 40-ych hadoch min. st., pazvolim sabie tut padać karotki pierakaz takoha inventarnaha apisańnia dvara Kluščany ŭ Śviancianskim pav., pamieščyka Jana Šyryna*).

Ŭsiaho aromaj ziamli ŭ dvare rachavałasia 278½ dzies., a sienažaciaŭ (pažniaŭ)—176 dzies. Z hetaha da dvoru naležyła 69 dzies. aromaj ziamli i 45 dzies. sienažaciaŭ, a sialanam 209½ dzies. arominy i 131 dzies. sienažaciaŭ. Poŭny nadzieł sialanski ličyŭsia ad 19 da 21 dziesiaciny; z hetaha: 13 dzies. arominy i 8 dzies. sienažaci. Ŭradžaj zbožža abaznačany „ŭ čatyry ziarniaty“, a sienažaci mieli davać z dziesiaciny pa 6½ dziesiacipudovych vazoŭ siena. Hetkaja sialanskaja haspadarka ŭ siarednim składałasia z 10 duš, razam z starymi i małymi. Ruchomaja majemaść jaje pradstaŭlałasia hetak: koniaŭ — 2, žarabio — 1, vałoŭ — 4, karoŭ — 5, ciałušak — 2, aviečak — 9, śviniej — 4, kozaŭ — 2 i kurej — 9**).

Sienažaci ŭ inventarnym apisańni hetaha dvoru nazvany „murožnymi“, a pali — „čarnaziom z hlinaj“, choć siahońniašnija žychary hetych ziamiel, pry ŭspaminie ab „murohu“ i „čarnaziomie“ ŭ ich, paciskajuć tolki plačyma. Vysokaja z boku pamieščyka acenka jakaści hruntu adnak zrazumiełaja: pamieščyk hetym tłumačyŭ Inventarnym Kamitetam — taksama z pamieščykaŭ złožanym — tyja zabaviazańni, jakimi byli abłožany sialanie ŭ jahonym pryhonie. A zabaviazańni hetyja sapraŭdy nia byli małymi.

Samaha tolki stałaha pryhonu („raboty“) z vałoki było 8 (vosiem!) dzion u tydzień: 4 mužčynskija (z upražaj) i 4 žanockija. Apráča pryhonu stałaha, u raboču čas, ad 25 červienia da 25 vieraśnia, „jak z daŭnych časoŭ, tak i ciapier“ (1844 h.) sialanie słužyli jšče hetak zvanyja zhony abo hvałty, na katoryja ŭ hod z haspadarki treba było dać: 12 piešych dzion muž. i 12 hetakich-ža dzion žan.; da hetaha dla pracy ŭ harodzie—pa 2 dni viasnoj i 2 dni ŭvosieni, razam — 28 dzion.

Ale heta jšče daloka nia ŭsio. Ŭvieś hnoj z dvara treba było vyvieźci za 1 tydzień, biaz ŭvahi na toje, kolki jaho jość. Małaćba taksama była paza narmalnaj kolejaj: „zvyčajem daŭnych časoŭ kožny sielanin (haspadar) pakolei pavinien prysyłać rabotnika ci rabotnicu

*) Vilenski Dziarž. Archiŭ: Arch. Deput. Szlach., Komit. Inwent., Nr. 2113.

**) Hetyja dadzienyja ab stanie haspadarki, jak i nižej padadzienyja pryhonnyja abaviazki typovaj sialanskaj haspadarki ŭziaty z vyšejnazvanaha inventarnaha apisańnia i adnosiacca da haspadarki Ivana K. z v. Kazanoŭščyna, jakaja naležała da dvara Kluščany. — A. K.

чым салома з збожжа стаячага. Другая важная асаблівасьць у тым, што жывёла ахватней есьць салому ня вольна зложаную, а прэсаваную. Натуральна, салома такая мусіць быць прад тым адпаведна высушаная, каб не заплесьнела.

Што датыча тэхнікі кармленьня саломай, дык практыка блізу згодна паказвае, што найлепш выкарыстоўваецца кармовая вартасьць саломы тады, калі яна падаецца жывёле ў мешанцы, напр. аўсянка з ячменкай. Асабліва чуткія на гэта каровы дойныя, масла каторых пры аднэй якой-небудзь саломе, не мяшанай, становіцца белым у колеры і лаеватым у будове. Заўважана было пры гэтым, што спаміж усякай саломы, для дойных кароў найлепшай ёсьць салома аўсяная, а для кормных — ячная. Жытняя салома як корм цэніцца мала, а йшчэ менш — салома пшанічная. Бачым тут цікавае зьявішча, як прырода сама дбае аб выраўнаньні: меншвартасная якасьць зярняці яравых збажжавін дапаўняецца большай вартасьцю іхняе саломы; наадварот — азіміны, зерне каторых мае большую кармовую вартасьць — маюць салому як корм далёка менш вартасную.

С. Л—ак.

Гэты нумар «Самапомачы» прысьвячаны спэцыяльна садоўніцтву.
РЭДАКЦЫЯ.

Прыгатуймася да вясьняньнага шчапленьня дрэваў.

Вясна гэта найбольш адпаведная пара шчапленьня (прывіваньня) садовых дрэваў, а найбольш пашыраным спосабам такога шчапленьня ёсьць гэтак званае кажухаваньне. Аб самым шчапленьні пагаворым на іншым месцы. Тут-жа пару слоў аб **прыгатаваньні самых** толькі ўшчэпавых галінак, гэтак званых **„зразоў“**, каторымі „дзікое“ дрэва прышчэпліваецца. Рабіць гэта трэба зараз-жа, пакуль дрэва не аджыло, пакуль у ім не адагрэўся і не паплыў жыцьцядайны сок. Як гэта рабіць?

Перад усім на зразы (*націск на* „ы“) трэба выбіраць дрэва зусім здаровае, добра родзючае і такога сорту, які ў данай ваколіцы мае добры збыт. Ня можна ніколі браць зразоў з дрэваў хворых, перад усім з такіх, што маюць рака, а таксама з тых, што гумуюць (сьлівы). Таксама ня радзяць браць на зразы гэт. зв. „ваўкі“.

На „зразы“, г. зн. тыя сучкі, каторымі дрэва прышчэпліваецца, найлепш браць сучкі з паўдзённага боку кароны дрэва і зверху. Зразаць трэба зразы ў безмарозны дзень, пакуль дрэва йшчэ „сьпіць“. Каб не перамяшаць сартоў, трэба зрэзаныя з аднаго дрэва галі кі адразу павязаць у асобныя пучкі, да каторых дадаецца пасьля картачка з надпісам чорным (ня хэмічным, бо замажыцца) алавіком.

ŭ panski dvor dla małaćby, da skančeńnia jaje, u pomač mašynie“. Treba adnak zaznačyć, što huberski Inv. Kamitet navat nia pryznaŭ „zvyčaju daŭnych časoŭ“ i nakazaŭ panu Šyrynu na vyvazku hnoju i na małaćbu brać ludziej tolki zvyčajnym paradkam, zaličvajučy dzień pracy za dzień pryhonu.

Dadać tut treba, što rabočy dzień u Kluščanskim dvare rachavaŭsia: viasnoj, uletku i ŭvosień ad uschodu da zachodu sonca, a ŭzimku — ad 5 hadz. rana da 7 uviečary.

Časam pryhon mieryŭsia nie na dni, a na „ŭroki“ (pasiahońniašniamu — „akord“) i tady: „za 4 dni muž. pryhonu na adnym tydni treba było vyarać 2 marhi (paŭtary dziesiaciny) arominy, zabaranavać—za 3 dni, zžać—za 4, abo pa 4 žančyny naznačajucca na hetym prastory na 1 dzień... Vyvazka kub. sažnia droŭ ličycca za 4 dni“. Žanockaja rabota na „ŭroki“ ličycca hetak: za 4 dni spraści: lonu na talki paŭfunta, kužalu 1 f., pačeśsia 3 f., zrebja 4 f., voŭny tonkaj 1 f., prostaj 2 funty.

Dla vyvazki dvornych praduktaŭ na rynak (u Vilniu, Dźvinsk, Śvianciany) bralisia z sialan churmanki; 30 viorst darohi z vozam u 20 pudoŭ rachavałasia za 1 dzień pryhonu. Adnak 82 viarsty darohi kožny haspadar štohod musiŭ adbyć darma (heta zvałasia „padorščynaj“).

Nie rachavałasia ŭ pryhonnyja dni i ciažkaja pavinnaść načnoha staražavańnia dvoru ad zachodu da ŭschodu sonca. Prychodziła-ž na heta kožny raz dvoje ludziej „biaznahannaha paviadzieńnia“.

Aprača hetaha była jšče pavinnaść „dabavačnaja“, jakaja z vałočnaj haspadarki vyhladała hetak:

Praža: talki (talka = matok) — pa $^1/_2$ funta, hruboj pražy—pa 4 f. i voŭny — pa 2 f.

Dań: pa 4 talki pražy, pa 3 kurycy, pa kapie jajok i pa kapie hryboŭ (baravikoŭ).

Dla poŭnaści zaznačyć urešcie treba, što — pavodle taho ž samaha inventarnaha apisańnia — arendnaja płata z volnaj ruki za vałočnuju haspadarku pakazanaj jakaści vynosiła ŭ toj čas kala 45 rub. Dzień-ža pracy ŭletku z upražnym inventarom rachavaŭsia za 15 kap., a biaz upražy (piešy) — 10 kap. Pud žyta kaštavaŭ 35 kap., pud siena — 12 kap., kuryca — 10 kap., kapa jajok — 20 kap. i kapa hryboŭ — 6 kap. sierabrom“...

Як і калі прышчэпліваць садовыя дрэвы?

Нашто прышчэпліваем садовае дрэва? Як і калі трэба прышчэпліваць? — На гэтыя два пытаньні пастараемся тут даць адказ.

Прышчэпліваем дрэва на тое, каб яго палепшыць, бо ніводнае дрэва ня будзе радзіць добрых пладоў, калі яго пакінуць расьці так, якім яно абышло з засеенага зярняці.

Гэткае палепшаньне называюць прышчэпліваньнем дзеля таго, што растучаму дрэўцу, найчасьцей — маладой дзічцы, дадаюць (зашчэпліваюць) пры гэтым малую галінку з здаровага, добра растучана дрэва, якое пры гэтым родзіць добрыя плады. На гэту думку прышлі людзі тады, калі заўважылі, што дзьве галінкі дрэва зрастаюцца з сабой, калі іх шчыльна прылажыць да сябе жывым месцам, гэтак званай мяздрой, якая знаходзіцца зразу пад карой. — Для яснасьці дальшай гутаркі аб прышчэпліваньні, умовімся называць тое дрэўца, якое хочам палепшыць — **падкладкай**, а тую галінку (сучок), якую зразаем з добрародзячага дрэва і прышчэпліваем на падкладку — **зрэзам**, або прышчэпам (бо мы гэту галінку з р а з а е м).

Спосабаў прышчэпліваньня (датарнаваньня зрэзу да падкладкі) ёсьць некалькі. Усе яны аднак кіруюцца да аднэй мэты:каб зрэз як найхутчэй зросься з падкладкай. Рознаякасьць спосабаў прышчэпліваньня тлумачыцца тым, што выконваецца гэта работа ў розныя поры году ды што падкладка бывае рознай грубіні: інакш прышчэпліваем вясной, інакш — улетку, інакш — на падкладку маладую (тонкую), інакш — на старую (грубую). — Само прышчэпліваньне ня ёсьць працай цяжкой, але вымагае пэўнага спрыту, упраўкі, якую ня можна здабыць ні чытаньнем, ні навет беспасярэднім глядзеньнем як нехта іншы гэту работу робіць: навучыцца добра прышчэпліваць можна толькі самай працай. Каб-жа не псаваць лішне жывога матар'ялу, найлепш вучыцца прышчэпліваньня складаючы адпаведна два кускі галінкі звычайнага лазьняка, вербы ці нечага падобнага. Калі гэта праца ўжо пойдзе гладка,

---

Гэтак зрэзаныя галінкі („зразы“) перахоўваюцца да часу шчапленьня ў такім месцы, каб яны ані перасохлі, ані заняліся цьвільлю.

Найлепш такія „зразы“ перахоўваць абложаныя мохам або ў вогкім пяску. Звычайна пучкі зразоў закопываюцца ў зямлю з паўночнага боку будынку, куды сонца дастаецца толькі позна і не адаграваe так хутка грунту. Гэтак закопываючы пучкі зразоў, састаўляюць іх не стацьма, а наўскос і прытрасаюць пяском. Калі прыйдзе пара шчапленьня, дык выйманыя з зямлі „зразы“ прад шчапленьнем трэба спаласкаць у вадзе, бо йнакш ад прыліпшай на іх зямлі хутка тупіцца садоўніцкі нож.

Пры шчапленьні трэба трымацца такога парадку, каб насамперш шчапіць тыя дрэвы, якія раней аджываюць, а знача ў наступным парадку: вішні, чарэшні, сьлівы, яблыні, ігрушы. Самыя „зразы“ пры гэтым трэба трымаць у зімне аж да астатку (да самага шчапленьня); перш мусіць пусьціць сок сама дзічка і на такой толькі дзічцы можна прывіваць „зрэз“. Калі-ж станецца наадварот, г. зн. калі „зрэз“ ужо пачне жыць, а дзічка йшчэ ня пусьціць соку, дык тады прышчэпліваны зрэз ад недастатку спажывы засохне.

В. Р.

Ab hadoŭli aviečak. 3)

Voŭna i aŭčynka. Jość krai, dzie hadujuć aviečak dziela małaka, z katoraha vyrablajuć syry. Nie małoje značeńnie majuć tak-ža aviečki tych rasaŭ, jakija dajuć šmat i dobraha miasa. I małočnyja i miasnyja rasy aviečak patrabujuć adnak asablivaha dahladu i kormu, jakich haspadarki našych ziamiel dać nia mohuć. Dziela hetaha nia budziem tut i havaryć ab vykarystoŭvańni aviečaha małaka i miasa. Nia budziem tak-ža havaryć i ab specyjalnych rasach aviečak vaŭnistych, bo i hetkija (napr. merynosy) nia mohuć u nas naležna raźvivacca z tych-ža pryčyn — niastačy adpaviednaj pašy i dahladu. Na našych zach.-biełaruskich ziemlach, pierad usim u Vilenščynie i Navahradčynie, jak ab hetym była mova ŭžo na pačatku hetych zaciemak, moža raźvivacca tolki aviečka **kažuchovaja,** jakaja aprača aŭčynki na kažuch, daje jšče ŭ hod dźvie stryžki voŭny na haspadarčyja patreby dy pry kancy — dobry kusok smačnaha miasa.


Jasnaja reč, što jak aŭčynki, tak i voŭna našych aviečak nie naležać da pieršaj jakaści, kali paraŭnać ich z adpaviednym tavaram suśvietnaha rynku. Adnak na haspadarčyja patreby našych varunkaŭ dajuć jany biazumoŭna tavar zusim dobry i tryvałki. Navuka ab utrymańni, sartavańni i vyrablańni voŭny davoli abšyrnaja, a tymsamym i nia lohkaja. Heta adnak tady, kali vyrablajecca tavar na rynak, asabliva rynak dalšy. Kali-ž mova ab tavary na patreby haspadarčyja ci navat i na patreby rynku bližejšaha, dyk u hetkim vypadku dosyć viedać nastupnyja najvažniejšyja praviły i imi kiravacca.

Vołas naahuł jość vytvaram skury i składajecca z troch składovych sučastak: vierchniaj, siaredniaj i sercaviny. Charakternaj aznakaj vołasu p r a ŭ d z i v a j voŭny jość toje, što ŭ im niama sercaviny. I heta adsutnaść sercaviny ŭ vołasie voŭny nadaje joj charakternyja svomaści: miakkaść, kučaravaść, falistaść, raś-

тады бяз страху можна прыступаць да самага прышчэпліваньня сапраўднага.

На пададзеных ніжэй рысунках паказаны некаторыя найбольш пашыраныя спосабы прышчэпліваньня: злучаньне, кажухаваньне, вочкаваньне. Пераглядзім гэтыя спосабы папарадку.

1. Спосаб **злучаньня** паказаны злева (першыя тры галінкі): першая галінка — зрэз, другая — падстаўка, трэцяя — зрэз злучаны з падстаўкай. Спосаб гэты вельмі просты і добры, але магчымы толькі тады, калі і падстаўка і зрэз бываюць аднолькавай грубіні. Асаблівасьцяй спосабу злучаньня ёсьць тое, што яго можна стасаваць і вельмі раньняй вясной, калі ў дрэве йшчэ не зварушыўся сок. Парадак працы гэткі: падстаўку і зрэз зразаем в о с т р ы м нажом наўскос так, каб плошча зразаньня была як можна даўжэйшая. На зрэзе мусіць быць 2—3 здаровыя вочкі, прычым адно з іх павінна знаходзіцца насупраць самага месца зразаньня. Зрэзаўшы гэтак падстаўку (пянёк) і зрэз, складаем іх як можна найшчыльней, стараючыся, **каб як найдаўжэйшы паясок кары зрэзу злучаўся з такім-жа паяском падстаўкі** (пня). Каб злучаны зрэз мацней сядзеў на падстаўцы, робяць часам на іх зубцы, каторымі абедзьве спалучаныя веткі дакладка зазубляюцца. — Калі гэта зроблена, прыкладаем зрэз на падстаўку і, прытрымліваючы іх двума пальцамі левай рукі, правай рукой



Прышчэпліваньне дрэваў спосабамі: а) злучаньня (першыя тры фігуркі з—лева) і б) кажухаваньня (чатыры фігуркі з—права).

ciažymašć, higroskopijnašć (zdolnašć ubirać u siabie vadu) i h. d. Usie pieraličanyja i inšyja svomašci praŭdzivaj voŭny nia možna znajšci ŭ našych aviečak i heta pakazvaje, što voŭna hetych aviečak nia jość voŭnaj praŭdzivaj. I navuka sapraŭdy dzielić usie rasy aviečak, pavodle jakašci ichniaj voŭny, na niekalki hrup. Adnej z takich hrup jość hrupa aviečak, z m i a š a n a j voŭnaj i siudy zaličvajecca aviečka vierasavaja. Voŭna aviečak hetaj hrupy składajecca z dvuch častak: 1. z vałośsia doŭhaha, hruboha, słaba kučaravaha, a časam i zusim roŭnaha, majučaha ŭ sabie sercavinu i 2. z vielmi cieńkaj, niapravilna skučaraŭlenaj poŭšci, jakaja sercaviny nia maje. Kolki jość u takoj voŭnie doŭhaha vałośsia i kolki karotkaj biassercavinnaj poŭšci—skazać naahuł nia možna. Jość voŭna, jakaja składajecca blizu z samaha tolki doŭhaha, hruboha vałośsia i naadvarot — jość voŭna, jakaja składajecca z samaj tolki poŭšci. Zvyčajna, adnak nie zaŭsiody, voŭna z bolšaj kolkašciu poŭšci cenicca daražej.

Naahuł-ža voŭna cenicca tym bolš, čym bolš jana adnolkavaja, nia toiki na roznych štukach žyvioły tej-ža stady, ale — i heta pierad usim — i na roznych čaściach cieła tej-ža žyvioły. Najlepšaja voŭna znachodzicca na bakoch i na łapatkach aviečki, krychu horšaja— na bakoch šyi, jašče horšaja — na kryžy i na chrybcie; dalej — jakašć voŭny jdzie ŭ nastupnym paradku: zadnija baki, šyja źvierchu i znizu, ściohny noh, urešcie voŭna na hałavie, na nahach (abnožki), na brusie i na zadzie. Što datyča płoci, dyk najmiakčejšaja voŭna byvaje z aviečki, horšaja—z lehčanaha barana i na astatku staić voŭna z harana plemnaha (ciakuna). Voŭna z jahniaci (pierad 1 hodam) ŭ canie vielmi kałyšacca, zvyčajna adnak byvaje krychu daražejšaja ad voŭny aviečki staroj. Jahniačaja voŭna miakčejšaja, ale zatoje mienš tryvałkaja ad voŭny starych aviečak. — Najmacniejšaj adnak voŭnaj jość voŭna plemnaha barana.

Zvyčajna voŭna atrymoŭvajecca stryžeń-

акручываем месца злучэньня старанна і моцна ліповым лыкам або гэтак званай рафіяй (лыкам з пальмовага дрэва) і дакладна замазываем усе берагі ушчаповай масьцю, каб усярэдзіну не даставалася паветра: гэта памагае хуткаму зрастаньню. Усю працу пры шчапленьні трэба выконываць скора, не марудзячы, каб не высыхалі ні зразы, ні падкладкі. Дзеля гэтага-ж ня можна шчапіць у гарачы сонечны дзень і калі пагода стаіць добрая, дык прышчэпліваць трэба або рана да 9-ай гадзіны, або паабедзе ад гадзіны 4-тай уніз.

2. Найлягчэйшым і таксама вельмі пашыраным спосабам прышчэпліваньня ёсьць гэт. званае **кажухаваньне**. Стасуецца гэты спосаб аднак толькі тады, калі падкладка грубейшая (старэйшая) як прышчэп (зрэз); прышчэпліваць спосабам кажухаваньня можна толькі тады, калі ў дрэве пойдзе сок і кара лёгка адстае ад дрэва (м ц красавік). На рысунку спосаб кажухаваньня паказаны чатырма верхнімі фігурамі з правага боку. Падкладка пры гэтым роўна зразаецца. Аднчасна прыгатаўляецца і зрэз седлаватым клінком так, як гэта паказана на рысунку, абапал грубейшага пня. Калі зрэз гатовы, дык, каб ён ня высах, прамываем ў вадзе і бяром у губу, а на падкладцы ад самага верху ўніз больш-менш на адну пядзю разразаем роўна кару, крыху яе адхіляем і шчыльна прыкладаем загадзя прыгатаваны зрэз. Тады адхіленую кару захіляем узноў і прыпіскаючы левай рукой, правай абкручываем так, як гэта паказана на апошняй фігурцы з правага боку. Гэтак асаджаны прышчэп старанна замазываем ушчаповай масьцю і работа скончана.

3. Падобным да кажухаваняя ёсьць яшчэ **прышчэпліваньне на прыстаўку**, а такжа прышчэпліваньне ў **шпару**. Гэтых спосабаў на рысунку няма, але яны у шмат чым падобныя да кажухаваньня. Розьніцца ж такае напрыклад прышчэпліваньне на прыстаўку ад кажухаваньня тым толькі, што на падкладцы ня толькі адлупліваецца кара, але ў ёй (у падкладцы)вырэзваецца з боку равок, у каторы пасьля ўсаджваецца адпаведна абрэзаны зрэз, які пасьля таксама зьвязваецца і абмазваецца ўшчаповай масьцю, як пры кажухаваньні.—Пры прышчэпліваньні ў шпару роўна зрэзаная —як пры кажухаваньні — падстаўка расшчэпліваецца зьверху нажом і ў гэты расшчэп устаўляецца загадзя прыгатаваны зрэз, канец каторага на плоска абструганы з двух бакоў. Месца, дзе зрэз злучаецца з падстаўкай, старанна абмазваецца ўшчаповай масьцю і лёгка абвязваецца.

Кажухаваньне, прышчэпліваньне на прыстаўку і ў шпару можна рабіць толькі ў пару, калі ёсьць у дрэве сок, прычым падстаўка заўсяды мусіць быць грубейшая як зрэз.

Агульная ўрэшце ўвага да разгледжаных вышэй спосабаў прышчэпліваньня—каб ні ў якім выпадку ня прышчэпліваць „прабуджанага“ зрэзу, асабліва ж, калі падкладка йшчэ „сьпіць“ (ня мае соку), бо тады прышчэплены зрэз адразу патрабуе шмат соку, а не знайшоўшы яго — заміpae з голаду. Таму зрэзы трэба старанна хаваць ад доступу цяпла.

4. Апошнім ўрэшце спосабам прышчэпліваньня пладовых дрэваў, паказаным на нашым рысунку, ёсьць гэтак званае **вочкаваньне**. Называецца яно так дзеля таго, што на падкладку прышчэпліваецца ня цэлы сучок (зрэз) з некалькімі вочкамі, а толькі адно **вочка**. Гэты спосаб прышчэпліваньня ўжываецца ўлетку, праз увесь месяц жнівень, калі сокі другі раз прыплываюць у дрэва (першы раз прыплывае сок раньняй вясной). Найлепш ужываць гэтага спосабу да пад-

---


niem žyvoj žyvioły, ale jość tak-ža voŭna, jakaja atrymoŭvajecca z stryžeńnia žyvioły zabitaj ci paŭšaj; urešcie jość jašče voŭna hetak zvanaja harbarskaja, jakaja atrymoŭvajecca vyčesvańniem zvyčajnych aŭčynak u harbarni pry vyrablańni. Naturalna, što jakaść usiakaj voŭny atrymoŭvanaj z žyvioły ŭžo niažyvoj, jość nižejšaja ad voŭny z žyvioły žyvoj. Stryžeńnie pavinna adbyvacca ŭ pamieškańni, dzie nie padymajecca pył Astryžanuju voŭnu treba pierad usim ačyścić ad astatkaŭ usiakaj pašy i addzialić ad jaje abnožki (voŭnu z noh i hałavy i naahuł voŭnu mienš vartasnuju). Kali voŭna praznačana na rynak, dyk źvivajecca jana ŭ skrutki (rulony) tak, kab voŭna ad aviečak była asobna, ad jahniat — asobna, ad baranoŭ — asobna i h. d. Nikoli nia možna źviazvać hetkich rulonaŭ za mocna, bo voŭna tady moža źbicca ŭ vojłak. „Kłustuju“ voŭnu apračа taho nia možna naahuł zrazu źviazyvać u skrutki, a treba spačatku jaje pakinuć praz paru dzion prasochnuć u suchim pravieŭnym miescy.

Astryžanuju voŭnu myć chatnim sposabam—nia dobra; lepš heta rabić tady jašče, kali voŭna na aviečcy. Da myćcia pryhodnaja tolki vada miakkaja, a kali jana ćviordaja, dyk treba da jaje dadać sody (poŭkilo sody na 100 litraŭ vady). Kab myćcio było bolš dakładnaje, treba pamytuju aviečku pa 5—6 hadzinach jašče prapałaskać. Dzie možna mieć da myćcia aviečak ciopłuju vadu (16° C), dyk heta vielmi pažadana.

Što datyča času, u jaki maje adbyvacca stryžeńnie, dyk u nas najčaściej heta robicca dvojčy ŭ hod: viasnoj i ŭvosieni. Spatykajucca adnak hałasy, što pry dvurazovym stryžeńni aviečak sama žyvioła lišnie mučycca našeńniem uletku ciopłaha kažucha, a voŭna da taho za hetki doŭhi čas źbivajecca ŭ vojłak. Tamu radziać siahońnia ŭžo stryhčy našyja aŭčynnyja avieški nia dva, a **try razy ŭ hod:** kala 15 krasavika, kala 15 žniŭnia i kala 15 śniežnia. Apošniaja stryžka (15.XII) adnosicca da aviečak praznačanych na plem. **V.Ach—vič.**

кладак маладых з тонкай карой; на падкладцы старэйшай прышчэпліванае вочка прыжывае вельмі цяжка.

Першай справай пры вочкаваньні ёсьць: даведацца, ці ёсьць у дрэве сок. Дзеля гэтага на падкладцы празначанай да прышчэпліваньня вострым нажом разрэзваем накрыж кару аж да жывога дрэва і прабуем, ці гэта кара лёгка адстае; калі так, дык знача сок ёсьць і шчапіць можна; калі-ж кара не адстае і толькі раздзярэцца, дык знача соку няма.



Прышчэпліваньне дрэваў спосабам вочкаваньня 3—лева: вочка з сярэдзіны і з надворку. Далей у права: нарэзаная кара прад шчапленьнем і апошняе — дрэўца прышчэпленае і абвязанае лыкам.

Парадак работы пры спосабе вочкаваньня гэткі: запасіцца трэба ў добрае тонкае ліповае лыка (або рафію) і ў сёлетнія сільныя зрэзы (толькі не „ваўкі!") з здаровых добрародных дрэваў. Трэба памятаць, што зрэзы ў гэту (летнюю) пару вельмі чуткія на сухасьць, таму за раз трэба зрэзываць іх гэтулькі, колькі за адзін дзень можна выкарыстаць; зразу трэба абарваць з зрэзаў лісты, пакідаючы толькі трончыкі, і ўставіць у збан з вадой, каб ня вянулі. Вочкі на зрэзах выбраных да прышчэпліваньня павінны быць грубыя і набрыняўшыя, а знаходзяцца яны пад неабарванымі трончыкамі лістоў.

Дальшы поступ працы гэтакі: —

Пень прышчэпліванай падстаўкі абціраецца чыстай намочанай у вадзе шматкай. На абцёртай гэтак кары нарэзваецца вострым нажом літара „т" так, як гэта паказана на рысунку, а сама кара асьцярожна адхінаецца. Тады бярэцца з збана галінка зрэзу і з яе вырэзваецца вочка так, каб пад ім разам з карой было і крыху маладога дрэва (мяздры). Гэтак вырэзанае вочка асьцярожна ўкладаем за адхіленую кару прышчэпліванай падстаўкі так, каб спад яе выглядала навер толькі самае вочка. Лішню кару вырэзаную з вочкам, якая ня месьціцца пад карой падкладкі, абрэзваем, а адхіленую прад тым кару падкладкі нанова закладаем так, як яна была прад нарэзваньнем літары „т," прычым само вочка, разам з чаранком (трончыкам) ліста мусіць выставаць наверх. Калі гэта зроблена, тады абвіваем прышчэпленае месца лыкам так. каб вочка мела вольнае месца дзеля росту і замазваем ушчаповай масьцю.

На гэтым работа і кончыцца. Астаецца цяпер толькі дагледзіць, ці прышчэпліваньне прынялося. — Чаранок ліста праз 2-3 тydні пажаўцее і адпадзе, а і самае лыка ў гэтым часе таксама можна ўжо адвязаць.

Прышчэпліваючы дрэва спосабам вочкаваньня, трэба сьцерагчыся, каб гэта вочка ня вырасла ў галінку да зімы тагосамага йшчэ году. Дзеля гэтага ня можна прышчэпліваць раней месяца жніўня, а і самае прышчэпліваньне трэба рабіць з паўночнага боку дрэўца, куды не даходзіць сонца і не пабуджае вочка да росту.

В. Р.

10-ць гадоў Земляробскай Акадэміі ў Датнове (Літва).

Калі літоўскі земляроб не адчуў так востра сучаснага гаспадарчага крызысу, дык заслуга ў гэтым немалая літоўскіх земляробскіх школ, сярод якіх на першым месцы стаіць Акадэмія ў Датнове. У канцы мінулага году літоўскае грамадзянства абходзіла 10 тыя ўгодкі існаваньня гэтай Акадэміі, як школы вышэйшай. Пазнаёмімся з гэтай установай хоць у кароткіх словах.

Сучасная Акадэмія, як школа вышэйшая, паўстала ў 1924 г., з спалучэньня дзьвюх школ: Земляробска Лесавога Аддзелу ўнівэрсытэту ў Коўні і Земляробскага Тэхнікума ў Датнове. Сам тэхнікум быў заснаваны ў 1911 г. і прад прыходам немцаў быў эвакуаваны ў Багародск (у Расеі). Увосені 1918 г. літоўскі ўрад ўжо адчыніў нанова „Датнаўскую Земляробскую і Лесавую Школу", якую крыху пазьней перайменаваў на „Земляробскі Тэхнікум".

Асобна ад тэхнікума, у 1922 г. быў заложаны Земляробска-лесавы Аддзел пры ўнівэрсытэце ў Коўні. Хутка аднак паказалася патрэба злучэньня гэтых дзьвюх школ у адну. Сталася гэта ў 1924 годзе, дзесяць гадоў таму назад. Пры гэтым новая школа сталася школай вышэйшага тыпу. У 1927 г. скасаваны быў лесавы Аддзел пры школе, а адначасна была праведзена спэцыялізацыя Аддзелу земляробскага, пры каторым ад 1927 да 1930 г. былі сарганізаваны і ўрухомлены 4 сэкцыі: 1. абрабляньня глебы і расьліннай прадукцыі, 2. жывёлагадоўлі, 3. эканомікі і 4 хатняй гаспадаркі (для дзяўчат).

Арганізацыйнае і навуковае жыцьцё Акадэміі кіруецца статутам, які ў 1928 г. быў зьменены. Паводле новага статуту, рэктара Акадэміі назначае дзяржаўны прэзыдэнт спасярод кандыдатаў прадстаўленых яму міністрам земляробства. У гэтым акадэмічным годзе рэктарам Акадэміі ёсьць праф. Вілкайтіс. Ад 1934 г. у Акадэміі працуюць: 16 прафэсараў і доцэнтаў, 5 этатовых і 9 неэтатовых лектараў і 22 асыстэнты і лябаранты.

Як рабіць ушчаповую масьць.

Каб прышчэпліванае дрэўца хутка і дакладна зраслося з усаджаным у яго зрэзам, трэба вельмі добра дапасаваць гэты зрэз да падстаўкі і належна іх пасьля зьвязаць. Аднак пры найбольш старанна́й рабоце ня можна так зладжыць з сабой падкладкі з зрэзам, каб паміж імі не ўваходзіла паветра, а з ім—і розныя дробнатворы — бактэрыі, якія гэткаму зрастаньню могуць перашкаджаць. Вось-жа на тое, каб адгарадзіць усякі доступ паветра ў месца зрастаньня зрэзу з падкладкай, гэта месца трэба дакладна абмазаць **ушчаповай масьцю.** У продажы досыць ёсьць усякай ушчаповай масьці,але раз,што ня ўсюды можна яе знайсьці, а да таго—яна бывае часта нядобрай, сапсутай. Дзеля гэтага пазнаёмімся тут з двума спосабамі прыгатаваньня гэткай масьці дома.

Спосаб першы: бярэцца 40 дэка (фунт) белай яловай смалы (жывіцы), 40 дэка растопленага сьвіннога сала і 20 дэка воску. Усё гэта растопліваецца ў гаршку на в о л ь н ы м агню. Пасьля гаршчок ад агню адсуваецца і ў растопленую мешаніну ўліваецца кварта алею і поўкварты тэрпатыны, добра перамешваецца і на 2—3 мінуты ўзноў прысуваецца да агню. Пасьля ўсё гэта выліваецца ў плоскую міску каб адстыла, а адстыўшае перакладаецца ў паперу, у якой гатовая масьць і перахоўваецца ў холадзе.

Другі спосаб: бярэцца 40 дэка (фунт) каліфоніі, 20 дэка сасновай смалы і 8 дэка лою. Усё гэта растопліваецца ў бляшанцы на вольным агню, пасьля адстаўляецца. Цяпер стала мяшаючы растопленую мешаніну ўліваем ў яе 20 дэка дэнатураванага сьпірту (сьпірту, што ўжываецца да паленьня) і масьць гатова. Прыгатаваную гэткім (танейшым) спосабам масьць трэба перахоўваць у закаркаванай бутэльцы, бо йнакш хутка вытыхаецца і цьвярдзее. Калі-б і гэтак трыманая масьць сьцьвярдзела, дык да яе трэба нанова дадаць гэтуль і сьпірту, каб разьмякчылася.

В. Р.

Мікалай Короленко.

Шкоднікі нашых садоў і змаганьне з імі.

У нашых садох ёсьць шмат розных шкоднікаў, каторыя вельмі часта робяць шкоды культурам дрэўным, што моцна ўплывае на кішэнь гаспадароў-садоўнікаў. І вось я хачу на гэтым месцы магчыма коротка пазнаёміць нашых садоўнікаў з выглядам найважнейшых, шкадлівых аваднёў (жамяры, палац. Insecta), іхняй біолёгіяй*) і спосабамі змаганьня з імі. Рабіць буду гэта паводле парадку прынятага ў навуковай сыстэматыцы.

I. Клапы (Hemiptera).

З інтэрэсуючых нас аваднёў належаць тутака перад усім: Мядоўкі (Psyllidae), Мэшкі (Aphididae) і Шчытковыя мэшкі (Coccina).

а) М я д о ў к і *(Psyllidae)* — гэта вельмі, дробненькія авадзёнкі,з прыплюшчаным целам каторыя высысаюць пучкі, а пасьля ўлазяць у іх сярэдзіну. У нас выступаюць два гатункі:

Ігрушная мядоўка (*Psylla pyricola*—Först) — належыць да вельмі шкодных для ігруш. Колер: лярваў**) — жоўты, німф — зялёны з

*) Біолёгія — навука аб жыцьці.

**) Усе авадні, у тым ліку і мядоўкі, праходзяць нармальна чатыры разваёвыя ступені: 1. яечка, 2. лярва (вусеніца), 3. пачварка (каўшак або люлечка) і 4. сьпелая форма.

Акадэмія сёлета мае наступныя катэдры: 1. хэміі (з кабінэтам фізыкі), 2. агрохэміі і глебазнаўства, 3. ботанікі спэцыяльнай, 4. агульнага абрабляньня глебы і гадоўлі расьлін, 5. спэцыяльнай гадоўлі расьлін, 6-7 агульнай і спэцыяльнай жывёлагадоўлі, 8. зоогыгіены і вэтэрынарыі, 9-11. агульнай, земляробскай і спэцыяльна-земляробскай эканоміі, 12. земляробскай інжынерыі і 13. пэдагогікі.

Курс навукі ў Акадэміі праходзіцца ў 7 сэмэстраў, з выняткам сэкцыі хатняй гаспадаркі, дзе навука трывае 6 сэмэстраў (3 гады). Да гэтага часу Акадэмію скончыла (абсольвавала) 232 асобы, спасярод якіх было 52 жанкі, што скончылі аддзел (сэкцыю) хатняй гаспадаркі.

У гэту пару Акадэмія мае 223 студэнтаў (134 мужч і 86 жанок) і 3 вольных слухачоў; 84 прац. студэнтаў паходзіць з вёскі. Па нацыянальнасьці — 96 прац. літоўцы.

Аплата за навуку ў сэмэстр выносіць 75 літаў, кватэра і харчы ў месяц—каля 60 літаў.

Характэрна для сужывецтва студэнтаў Акадэміі тое, што Акадэміцкі Суд дагэтуль ня меў ніводнай справы.

Абсольвэнты Акадэміі працуюць у розных галінах жыцьця: як земляробскія школы, фаховыя арганізацыі, коопэрацыя і г. д.

Гэта ў кароткіх словах гісторыя і рэзультаты працы галоўнай літоўскай земляробскай школы.

Для нас беларусаў гэта ясны прыклад, як можа разьвівацца культура і дабрабыт народу ў сваей собскай дзяржаве. Бо-ж трэба ведаць, што на залажэньне гэтай самай Дэтнаўскай Школы грамадзянства дарма чакала дазволу ад расейскіх уладаў аж цэлых 12 год: ад 1899 г.,калі была паслана цару просьба, — да 1911 г. А як настаў літоўскі ўрад, дык школа была ўрухомлена ў працягу некалькіх месяцаў. Не для самай, знача, толькі палітыкі патрэбна народу свая палітычная незалежнасьць: патрэбна гэта незалежнасьць для самага жыцьця, для існаваньня народу.

А. К.

бранзовым рысункам, дарослых (imago) — жоўты або чырвона-бранзовы ў чорныя паяскі. Зімуюць у форме дарослай у шчэлінах кары, а вясной саміцы складаюць яечкі. Шкоднік гэты расьце вельмі хутка, так, што ў працягу 4-х тыдняў даходзіць ужо да формы дарослай, дзеля чаго за адно лета выступае 4, а навет і 5 пакаленьняў. Пад уплывам іх ссаньня лісты і плады перад часам ападаюдь і дрэвы затрымліваюцца ў разьвіцьці.

Другі гатунак мядоўкі, Яблынная мядоўка (*Psylla mali*—Först) выступае на яблынях, але ў нас вялікіх шкод ня робіць.

Спосабы змаганьня з мядоўкамі галоўным чынам палягаюць на абпырсківаньні зімой дрэў садоўніцкім **karbolineum'am**. Калі гэтага ня зробіцца, то тады трэба вясной нападзеныя дрэвы абпырсківаць іншымі сродкамі, ужыванымі проціў мэшак (глядзі ніжэй).

Мэшкі (*Aphididae*)—гэта невялікія аvадзёнкі, ад 2 да 4 мм. даўжыні, з вельмі кволым целам. Выступаюць яны як формы крылатыя (з чатырма скуркавымі крылкамі) або зусім бяскрылыя. Размнажаньне іх можа адбывацца ня толькі пры помачы самцоў, каторыя найчасьцей зьяўляюцца ўвосені, але і так званым спосабам партэногенэтычным (parthenogenesis), гэта знача без аплодненьня. Залежна ад гэтага саміцы складаюць яечкі, або выдаюць жывароднае патомства. Разьвіваюцца вельмі скора, так, што ў працягу аднаго лета выступае некалькі пакаленьняў. Мэшкі, жывучы на розных расьлінах, высысаюць з іх сокі, што пры масавых паявах робіць вялікія зьнішчэньні сярод расьлін упраўных і дзеля таго належаць яны да найпаважнейшых аваднёў-шкоднікаў. З мэшак падаю такія гатункі:

Яблынная мэшка (*Aphis pomi*—De Geer)— гэты дробненькі, ясна — зялёны авадзёнак; высысае пучкі і маладыя лісточкі, каторыя пад уплывам таго ссаньня пачынаюць моршчыцца і скрочывацца, гэтым самым хаваючы цэлыя каленіі мэшак ад ворагаў, вялікай сьпекі і т. п. Мэшка гэтая ёсьць вельмі паважным шкоднікам, перад усім грозны ў школках маладых дрэвак. яблыняў. Яечкі мэшкі зімуюць на кончыках галінак.

Агрэставая мэшка (*Aphis grossulariae*— Kalt) — зялёнага колеру, з ясна-жоўтымі вусікамі і трубачкамі; у крылатых формаў грудзі чорныя, а брушка зялёнае. Выступае на кончыках галінак агрэсту і парэчак у V і VI.*) Пад уплывам іх жыраваньня трончыкі лістоў скручываюцца, а лісты прыціскаюцца да галінак.

Сьліўная мэшка (*Hyalopterus pruni*—*F.*)— гэта вельмі паважны шкоднік сьлівак. Ёсьць ён бруднага жоўта-зялёнага колеру, з цёмнай галоўкай; бывае прычынай скручываньня лістоў.

Вішнёвая мэшка (*Myzus cerasi*—F.)—мэшка гэтая выступае на маладых сьцяблох і лістох вішняў і чарэшняў. Колеру яна чорна-блішчучага, хоць летам некаторыя пакаленьні ня маюць свайго нармальнага колеру і тады астаюцца чорна-зялёнымі або чорна-бурымі. Вельмі грозны ў школках маладых дрэвак; лістоў ня скручывае.

Апрача пададзеных тутака гатункаў мэшак, выступае ў нас яшчэ шмат іншых гатункаў спатыканых радзей.

Спосабы змаганьня з мэшкамі.

1) Калі ўжо ўбачым, што лісты скручываюцца, ці заўважым якія іншыя прыметы бытнасьці мэшак, або найлепш яшчэ перад гэтым, трэба абпырсківаць дрэва **табачным прэпаратам**, каторы прыгатаўляюць такім спосабам: 400 грам. найгоршай табакі (тытуну), як напрыклад махоркі, на 12 літраў вады, гатаваць праз 6—8 гадзін, пасьля перацадзіць і дадаць 24 літры вады і 125 грам. шэрага мыла распушчанага ў гарачай вадзе. Гэтым адварам пры помачы абпырсківача трэба распыляць гэтую плыўкасьць на дрэва 3—4 разы, у перарывах па 7—10 дзён, зьвяртаючы галоўную ўвагу, каб добра абпырскаць споднія часьці лістоў і маладыя галінкі, дзе найбольш сядзяць мэшкі.

2) Вясною шмараваць пні дрэў, а галіны абпырсківаць **вапенным малаком**, якое прыгатаўляюць такім спосабам: каб атрымаць 100 літраў гэтай плыўкасьці, трэба ўзяць каля 6 кілё чыстай добрай выпаленай вапны, усыпаць у які-небудзь кошык і ўсадзіць на момант ў ваду. Пасьля выбраны з вады кошык трэба накрыць мяшком, а калі ўжо вапна рассыпіцца на дробненькі парашок, у той-жа час дадаць да яго вады, разьмяшаць добра, перацадзіць; атрыманая жыжка—гатовая да ўжываньня.

3) Каб перашкодзіць паяўленьню шкоднікаў, ужываецца зімой або ў пачатку вясны, калі яшчэ пучкі не набрыняюць, так званая **карбольная мешаніна**, іначай — садоўніцкі карболінэум. Спосаб прыгатаваньня: распусьціць ў гарачай вадзе 200 грам. шэрага мыла і дадаўшы (паступова) 100 грам. неачышчанай карбольнай кісьлі, добра вымешаць і даліць да таго яшчэ 12 літраў вады. Ужываць у дзень пагодны, даволі цёплы і калі няма яшчэ на дрэве лістоў.

4) Летам, каб зьнішчыць мэшкі ці іншыя авадні, трэба абкурыць сад **табачным дымам**. Раніцай або ўвечары, калі пагода ціхая, найлепш пасьля дожджу, трэба параскладаць кучкі саломы, каля 40 на $^{1}/_{2}$ га саду, а на іх —тытуну (адпадкаў), на кожную кучку па 2 кілё, мяркуючы так, каб па падпаленьню гэтых кучак, выходзячы дым абняў цэлы сад і трымаўся там праз якія 2 гадзіны.

5) Увосені, калі ўжо лісты апалі, у цёплы і ясны дзень, або вясною, калі яшчэ няма набрыняўшых пучкоў — вельмі добра абпырскаць дрэва якіх 2—3 разы разчынай **сярчану жалеза**. Склад: на 12 літраў вады 1 кілё сярчану железа і 1 кілё вапны. Увага:

*) Рымскія цыфры заўсёды азначаюць месяцы.

калі ўжо пачынаюць распушчацца пучкі, то гэтай плыўкасьці ня можна ўжываць, бо можа пашкодзіць кволым часьцям расьлін.

б) Таксама добра нішчыць мэшкі **мыльна-нафтовая мешаніна**, якую трэба гэтак прыгатаўляць: у 3 літрах гарачай вады распусьціць 100 грам. шэраша мыла, пасьля безперарыву мяшаючы ўліваць паступова 600 грам. нафты, мяшаць найменш 15 мінут, ізноў уліць 3 літры гарачай вады і яшчэ 12 літраў сьцюдзёнай вады. Атрыманую гэткім спосабам мешаніна распырсківаць можна толькі тады, калі яна ёсьць вымешаная і толькі да 6 гадзін па зробленьню. Дзень выбіраць ня вельмі цёплы.

б) Шчытковыя мэшкі (*Coccina*)— жывуць найчасьцей на кары дрэў, пад абаронай шчыткоў. Лярвы іх, якія бываюць схаваныя пад шчыткамі няжывых саміцаў-матак, разлазяцца па цэлай расьліне, шукаючы добрага месца жыраваньня. У гэным часе яны безбаронныя, бо яшчэ не пакрытыя шчыткамі і таму тады найлепш іх нішчыць. Пасьля яны некалькі разоў ськідаюць скуркі, а саміцы губяць ножкі і робяцца нярухомымі, акрываюцца шчыткамі і па апладненьню самцамі кідаюць пад сябе яечкі і гінуць. Але самцы заўсёды рухавыя, а маючы да гэтага крылкі, могуць лёгка вышуківаць саміцаў.—Шчытковыя мэшкі наколываюць кару і высысаюць з расьлін шмат сокаў, дзеля чаго дрэвы слабеюць і менш даюць пладоў, а асобныя галінкі ці навет дрэўкі вельмі часта гінуць. Варта зазначыць два гатункі шчытковых мэшак:

Яблынны чарвец (*Lepidoraphes ulmi*—L.) на яблынях, менш на іншых дрэвах распаўсюджаны. Шчыток саміц даходзіць да 3-х мм. даўжыні і мае форму пукатай коскі, найчасьцей бранзовага ці шэра-бранзовага колеру. Сам звадзень белаваты або жоўты, даўжыні 1 мм.

Агрэставы чарвец (*Lecanium corni*—Bouche) мае шчыток паўкруглы. Паяўляецца на пладовых дрэвах, а так-жа на агрэстах, парэчках і малінах. Вельмі шкодны.—Спосабы змаганьня: падчас зімовага сну дрэў, падаслаўшы на зямлю мяшкі або посьцелкі, аскрабаць кару і абпырскаць дрэва садоўніцкім карболінэўмам.

(д. б.).

Яшчэ сяголеньня загляньце ў свой сад і абчысьціце яго, бо заўтра, калі аджыўшыя рабакі распаўзуцца па ўсім дрэве, ратунак будзе ўжо спозьнены.

Яшчэ аб палёгках у сплачываньні земляробскіх даўгоў.

У адным з леташніх нумароў „Самапомачы“ (11) былі апісаны найгалаўнейшыя пастановы закону з 24.X.34 г. аб „аддаўжэньні“ земляробскіх гаспадарак. Ад таго часу шмат адплыло вады і не адзін з тых, што цешыўся новым законам, у канцы пераканаўся, што карыстаць з яго ня так ужо проста і лёгка.—Тут мы пазнаёмімся з зьместам міністэрскага распараджэньня з дня 11.XII.34г., якое выясьніць мае, як названым законам карыстацца.

Вось-жа паводле гэтага распараджэньня сплата даўгоў у коопэратыўных банках (касах Стэфчыка), ашчаднасьцёвых і камунальных касах раскладаецца: для гаспадароў групы „А“ (тыя што маюць ня больш 75 га зямлі) на 14 гадоў, а для гаспадароў групы „В“(ад 75 да 750 га)—на 10 гадоў, для арэндатараў—на 5—10 гадоў пры 4,5 проц. гадавых (дагэтуль было на 7 гадоў пры 6,5 проц.). Сплата даўгоў раскладаецца на часьці (на раты) так высокія, каб раўняліся ад 2 да 10 проц. для групы „А“ і ад 2 да 20 проц. для групы „В“ самага капіталу доўгу. Гэткую раскладку доўгу на часьці (конвэрсію) трэба падпісаць з банкам найпазьней да дня 31 сьнежня 1935 г. Ня можна конвэртаваць (раскладаць на часьці) доўгу, калі ён зроблены пасьля 1 ліпня 1 ліпня 1932 г.; з тых-жа даўгоў, што зроблены прад 1 ліпнем 1932 г. ня можна конвэртаваць такіх, каторыя ў аднэй касе не перавышаюць 100 зл. для гаспадароў групы „А“ або 1000 зл. — для гаспадароў групы „В.“

Справу сплаты даўгоў прыватных вырашае распараджэньне Міністраў Земляробства і Справядлівасьці з дня 10.I.1935 г. Паводле гэтага распараджэньня ўстанаўленьне сплаты вышменаваных даўгоў належа да гэтак званых Перамірных Урадаў (Urzędy Rozjemcze). Каб завесьці справу ў Перамірным Урадзе, трэба аплаціць: упісныя ў вышыні ½ проц. доўгу, найменш аднак 2 зл. Калі Перамірны Урад зацьвердзіць пададзеную угоду, дык упісная аплата выносіць толькі адну пятую часьць вышэйпаказанага упіснога. Апрача гэтага упіснога, ёсьць яшчэ з. гв. ўпіснае сталае, залежнае ад вышыні доўгу, 5—15 зл. Канцэлярыйныя аплаты за дакумэнты выносяць 50 грашоў за бачыну (старонку).—Дальшым выдаткам ёсьць кошт пастыпаньня (сьведкі, сьледзтва і г. д.); вышыню гэткага выдатку ўстанаўляе сам Перамірны Урад у кожным выпадку асобна.

Б. К.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ
Z upavažnieńnia Bielaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Vilni.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

ГАСПАДАРЧАЯ ХРОНІКА.

Ад выдавецтва „САМАПОМАЧЫ.“ Гэты падвойны 2—3 нумар „Самапомачы“ за м-цы люты і сакавік выходзіць з малым спазьненьнем. Наступныя нумары будуць выходзіць у рэгулярных (месячных) одступах часу. — Адначасна просім і папераджаем нашых паважаных чытачоў аплаціць падпіску. Хто гэтага ня зробіць, той наступнага ўжо нумару „Самапомачы не дачакаецца. Кожны ў уласным інтарэсе, каб ня было затрымкі ў высылцы часапісу, павінен зараз-жа аплаціць належную падпіску. Спосаб перасылкі грошаў пададзены на бачыне 10-ай.

Як працуе спажывецкая коопэратыва „Самапомач“ у Вял. Ліпе? Ніжэй друкуем выпіску з гадавога білянсу коопэратывы „Самапомач“ у Вял. Ліпе, Нясьвіскага пав. Да пададзеных у выпісцы лічбаў варта дадаць наступныя паясьненьні.

Коопэр. „Самапомач“ у Вялікай Ліпе зарганізавана была ў 1933 г. і абслугоўвае вёскі Вялікую Ліпу, Баяры, часткова Высокую Ліпу, двор Ліпу і бліжэйшыя хутары. Сьвядамасьць коопэратыўная і грамадзкая сярод сяброў коопэратывы досыць высокая. Ідзе сюды тры дзесяткі „Самапомачы“. Ад 1929 г. існуе ў Вял. Ліпе кооп. малачарня. Абедзьве коопэратывы цесна супрацоўнічаюць.

На 31 сьнежня 34 г. Коопэр. „Самапомач“ лічыць 85 сяброў. Урад коопэратывы кіруецца к таму, каб чужыя капіталы зусім выцісвуць з коопэратывы і ў 1935 годзе зусім імі не карыстацца.

Чыстае надвыжкі за 1934 г. коопэратыва мае 455 зл. 20 гр.

Агулам абароту за 1934 г. „Самапомач“ зрабіла 21.101 зл. 33 гр.

„Самапомач“ у 1935 г. і наступных гадох будзе кіравацца к таму, каб коопэратыўным парадкам г. зн. бяз помачы прыватнікаў сарганізаваць даставу ўсяго, што патрэбна на вёсцы, а так-жа зарганізаваць збыт усякіх тавараў гаспадарскіх.

Ацэнка сыроў у Баранавічах у канцы 1934 г. У ацэнцы прымалі ўдзел каля 20 самастойных вытворцаў Найлепшыя сыры аказаліся з коопэратыўнае малачарні ў Флёрыянове, а рэшта сыроў каля 80 процэнтаў аказаліся або трэці гатунак, каторыя могуць быць дапушчанымі да продажы і консумцыі з пэўнымі засьцярогамі, або зусім нікуды нягодныя, так званыя сыры да пераробкі. Найгоршыя—сыры баранавіцкіх гуртаўнікоў і складніцы „Сполэму“.

Пасьля ацэны адбылося паседжаньне саюзу продуцэнтаў сыра. Выясьнілася пры гэтым, што дробныя дастаўцы — сяляне ў коопэратыўных малачарнях дастаўляюць лепшае малако як двары.

На гэтым-жа зьезьдзе з урадавага боку была прапанова дамагаецца ад Цэнтралі Малачарскага Саюзу ў Варшаве, адчыненьня аддзелу ў Баранавічах. Ніхто аднак гэтым не захапіўся, а надварот—пасыпаліся нараканьні на гаспадарку гэнага Саюзу і прадстаўнікі Саюзу паехалі ў Варшаву з нічым.

Наша пошта.

Гурток Б. І. Г. і К. у Б—ве: Разам з папярэднімі маем цяпер ад Вас падпіскі 6 зл. Пастарайцеся канешна дапоўніць дзесятку.

К-ва „Самапомач“ у В. Л. Выпіску з білянсу зьмяшчаем. Справаздача аб сходзе бадай што спозьнена. — Праўную нараду адсылаем асобным пісьмом.

М. С—ка у В. Л. і Я. Яр.—віч у Ю—кох: праўныя парады Вам высланы асобнымі пісьмамі.

Я. Пет—ко ў А—ве: атрымалі, дзякуем, застасуем ад наступнага нумару. Пастарайцеся сабраць „дзесятку.“

А. Ул. С—кі ў А—нах усё прошанае Вамі—выслана. Ці атрымалі? А як там справа, [аб каторую мы Вас прасілі?

А. Фр. Ч—скі у М—ны (Францыя): атрымалі, дзякуем, будзем высылаць.

Ул. Чачык, М. Місюкевіч, А. Давідовіч, А. Чэбатарэвіч, М. Бандарчук — пробныя нумары высылаем. Дальшыя вышлем толькі па атрыманьні ад Вас падпісной платы.

Ані—к В.: патрэбныя Вам друкі высланы другі ўжо раз: ці атрымалі Вы іх?

Я. Ге—ш: Усе прошаныя кнігі і часапісы высланы. „Самапомач“ будзем акуратна высылаць на паказаны адрэс у З. Тое самае і з „Б. Кр.“. Напішэце нам пра сваё жыцьцё.

Д. Ул—ні к у Б—х: часапіс, аб каторым пішаце, выдаюць не земляробы, а фабрыка штучных гнаёў. Дык ня дзівуйцеся, што там Вам будуць радзіць „як найбольш гнаіць“ — гэта-ж зразумела.

Б. М—віч у К—х: такой пароды бульбы мы ня чулі. Адно з двух: або гэты назоў перакруцілі Вы, або яго перакруцілі прадаўцы каб лягчэй атуманіць галаву нясьведамым людзям.

Выпіска з білянсу

Коопэратывы „САМАПОМАЧ“, коопэратыва з адказнасьцю паямі ў в. Вялікая Ліпа, Нясьвіскага павету, за 1934 год.

Чынны стан:

Каса	Зл.	71.28
Тавары ў краме й магазыне	„	994.23
Даўжнікі за тавар . . .	„	106.47
Рухомасьці	„	314.32
Пай у Саюзе Спаж. Кооп.	„	94.—
Іншыя належнасьці . . .	„	334.98
Пераходныя сумы . . .	„	45.—
Залог (каўцыя)	„	3.90
Разам Зл		**1964.18**

Доўжны стан:

Паявы капітал	Зл.	648.36
Запасны фонд	„	258.01
Вэксалі — акцэпты Саюзу.	„	300.—
Рахунак адчынены ў Саюзе Спажывец. Коопэратыў	„	1.93
Рэзэрва на падаткі . . .	„	250.—
Пераходныя сумы	„	50.68
Чыстая надвышка	„	455.20
Разам Зл.		**1964.18**

Управа Коопэратывы.

БЕЛАРУСКІЯ КООПЭРАТЫВЫ! Прысылайце ў „Самапомач“ выпіскі з Вашых гадавых білянсаў! „Самапомач“ абвесьціць іх Вам БЯСПЛАТНА.

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ